Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Выходзіць што тыдзень.

# НАША НІВА

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і даставкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пак дае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 7 Марца 1915 г. № 9

## Вайна і дэпутаты.

Кожын раз, калі ў Гасударственай Думе падымалі свой голас «левые» дэпутаты, — супроць іх выходзілі бяз ліку паны Замыслоўскіе, Бобрінскіе, Марковы ды іншые і з вялікім гневам грымелі, даводзючы, бытцым «левые» затым жадаюць розных перамен у жыцьці дзержавы, каб «загубіць» Расею. Кожын раз, як толькі між грамадзянствам падымаўся якіколечы рух,—гэтые самые паны пачыналі крычаць, што гэта — «здрада», што «левые»—«прадалі Расею» за японскіе, жыдоўскіе, ці нямецкіе грошы. І здавалося, што німа ва ўсей старане людзей, каторые больш за «правых» любілі бы сваю бацькоўшчыну.

Праўда, ня ўсе ім верылі.

Але яны на гэта ня ўважалі: горда насілі імя «найлепшых сыноў Расеі».

Прыйшла вайна. Для тых, хто заўсёды хваліўся сваім «патрыотызмам», настаў найлепшы час, каб выказаць сваю любоў да Расеі. І першые павінны былі выказаць тые, што стаяць па-над усім грамадзянствам: думскіе дэпутаты «правых» партій.

Ня тое-ж выйшла. Даволі глянуць на спіс дэпутатоў, каторые тым ці іншым спосабам папалі на вайну, каб пераканацца, што «правые» недзе счэзьлі бяз сьледу. Чуем з газэт, што «левых» на вайне багата: нідаўна згінуў у бітве пад Жырардовам (у Польшчы) быўшы дэпутат Ш-яй Думы, А. М. Колюбакін—з партіі «народнай свабоды». Гэтымі днямі памёр, захварэўшы на тыфус, вядомы грузінскі грамадзкі працоўнік, член тэй-жэ партіі, князь Геловані, каторы загадываў санітарным атрадам Гасударственай Думы на Каўказі, ды вельмі многа працаваў, памагаючы хворым, цікунцом, раненым салдатам. Згінуў у баю ешчэ адзі быўшы дэпутат — «левы», Попов, а дэпутат Веліхов дык і цяпер недзе на пазыціях. — А колькі іх працуе ў санітарных атрадах, атрадах дзеля харчэвой помачы народу, пацярпеўшаму ад вайны? Тут і Некрасов, і Ніколаев, і Джафаров, і Львов ды іншые, а ўсе—«левые», ўсіх іх ешчэ так нідаўна вінавацілі, бытцым яны «прадаюць» сваю старонку... А дзе-ж тые, хто іх у гэтым вінаваціў?

Адзін толькі Пурышкевіч паехаў з санітарным поездам. Рэшта—сядзяць на спакойных мейсцах і далей ваюють з «унутрэным ворагам...»

Г. Б.

---

## ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце.** (*Тэлеграмы П. Т. А. ад Штабу Верхоўнаго Глаўнакамандуючаго*).

26 лютаго. Паміж Нёманам і Віслай асабліва заўзятые бітвы адбываліся 25 лютаго у районі Сімно, ў далінах Омулева, Ожыца і ў напрамку к Прасньшу. На левым березі Віслы без перамен. У Карпатах усе непрыяцельскіе атакі адбіты, прычым каля Горліц расейскай проці-атакай знішчожэны аўстрыяцкіе аддзелы, меціўшыеся пасьля безкарыснай ночнай атакі акапацца перэд расейскім фронтам. У Ўсходней Галіччыне, на поўдня ад Чыжнёва, расейцы пасунулі немцоў.

27 лютаго. У Сувальскім районі немцы, утрымываючы Сімно і Августов, перайшлі ў наступленьне на г. Сэйны, ў районі катораго адбываўся бой. На правым березі Нарэва сільная гарматняя стрэляніна. На фронце паміж Омулевам і Ожыцам і ў напрамку к Прасньшу наступленьне немцоў стрымліваецца расейскім войскам. На левым березі Віслы без перамен. На Карпатах на фронце між Горліцэ і Лупковскім перэвалам расейцы зрабілі колькі энэргічных проці-атак. На поўдзень ад Горліцэ непрыяцельскіе часьці, перайшоўшые Сэнкувку і меціўшыеся умацавацца на яе правым березі, былі перакалоты. Расейскіе разведчыкі акружылі тры высунуўшыеся наперад аўстрыяцкіе роты і захапілі іх у палон. Найкарысьнейшым быў удар расейцоў у бок у районі глаўнай аўстрыяцкай атакі, дзе расейцы ўзялі вёскі Лупков і Смольнік з акружаючымі высотамі і захапілі дзьве цяжкіе гарматы, сем кулемётоў і перэвязковые, пункты з доктарамі. Усяго узята у палон каля 4000 с 70 афіцэрамі. У районі Раббэ і Козювкі праціўнік ізноў кідаўся ў безкарысные, вельмі заўзятые атакі, усюды храбра адбітые расейскім войскам з вялікімі для непрыяцеля стратамі. У Ўсходней Галіччыне каля вёскі Незвіска на Днестры донскіе казакі зусім знішчожылі тры эскадроны прускіх гусароў. Ацалеўшых 3 афіцэроў і 25 гусароў узялі у палон.

28 лютаго. На ўсіх фронтах 27 лютаго вялікшых бітвоў не было. На левым березі Нёману і на шляхах к Гродні бітвы мелі характар стычак. На поўнач ад Сімно расейцы самнулі невялікі нямецкі атрад. Расейская артылерыя захапіла палонных і 2 гарматы. У вазёрах у районі Копцёва два непрыяцельскіе аддзелы (калонны) папалі ў неспадзеўкі пад расейскі гарматні агонь і мелі немалые страты. Атсунуўшы праціўніка ў бліжэйшые к Августову лесные участкі, расейскае войска спынілося ў районі Ліпска. На правых берагох Бобра і Нарэва без перамен. Гарматы Осовца карысна змагаліся з асаднымі гарматамі. Проба немцоў наступаць у районі рэкі Ожыч не прыбавіла ім 27 лютаго нічога к займаным мейсцам, і нават прышлося ім уступіць для расейцоў некаторые вёскі і зарасьнікі. На поўнач ад Прасныша немцы падыйшлі да расейскіх акопоў на 1500 шагоў, але ім не ўдалося тут умацавацца. Пад расейскай стрэлянінай немцы атсунулі свой фронт. У акопах, пакінутых немцамі, расейцы захапілі шмат аружжа і ваенных запасоў. У Карпатах і Усходней Галіччыне сільная сьнежная мяцеліца і глыбокі сьнег, аднак нягледзючы на гэта, ў районі Смольніка расейцы змусілі аўстрыякоў атсунуцца ад расейскіх пазыцій. Праціўнік ізноў атакаваў расейцоў ў районі Козювкі, але безкарысна.

1 марца. Паміж Нёманам і Віслай бітвы адбываюцца толькі ў далінах Омулева, Ожыца і ў напрамку к Прасньшу, агулам на фронце каля 50 вёрст. Пробы праціўніка пасунуцца наперад усюды адбіты. Расейскае войска, перайшоўшы 28 лютаго у проці-атаку заўладало некалькімі вёскамі. У іншых районах праваго берэгу Бобра і Нарэва і леваго бераго Віслы толькі гарматняя стрэляніна. У Карпатах сільная мяцеліца. У районі Лупковскаго перэвалу расейцы пасунуліся наперад і ўзялі 600 з лішнім палонных пры 14 афіцэрах і 6 кулемётоў. На фронце Раббэ—Радзеюв—Студзеннэ аўстрыякі усё стараюцца прарваць расейскі фронт, але маюць цяжкіе страты. У районі Козювкі і Рожанкі немцы ізноў вялі непрарыўные страшэнна заўзятые атакі на расейскіе пазыціі. Атакі гэтые, аднак, усюдах адбіты з вялікай для праціўніка стратай. У часе проці-атакі расейцы захапілі некалькісот палонных. У Усходней Галіччыне расейцы лёгка адбілі паўторные атакі непрыяцеля каля вёскі Незвіска, на Днестры. Пры гэтым адзін аўстрыяцкі батальён быў зусім разсеяны расейскай проці-атакай. Пад Перамышлем расейцы заўладалі, неўспадзеўкі напаўшы, непрыяцельскімі пазыціямі каля вёскі Малковіцэ. Занімаўшы гэтые пазыціі аўстрыяцкі батальён узяты ў палон.

2 марца. У районі Прасныша расейцы на ўсім фронце ад чыгункі на Млаву да рэкі Ожыц і на левым березі яе з боем пасунуліся наперад. Нямецкіе проці-атакі усюдах адбіты. Гарматы Осовца падбілі некалькі цяжкіх асадных гармат, быўшых на акуратнай далечыні выстрэлоў ад крэпасьці. На левым березі Віслы бітвоў не было. У Карпатах, агулам без перамен. Атакі аўстрыякоў на Балігродзкім напрамку і немцоў на высату 992 каля Козювкі адбіты. У Усходней Галіччыне расейскае войска атціснула праціўніка ў районі на поўнач ад Обэртыня. Пад Перамышлям гарматняя стрэляніна.

3 марца. На левым березі Нёмана расейцы выперлі пярэдніе аддзелы немцоў. Наступленьне расейскаго войска па абадвух берагох рэкі Ожыц адбываецца карысна. Пясьля вельмі заўзятай бітвы расейскае войска ўзяло вёскі Стэнга і Еднорожэц і адбіло страшэнную проці-атаку немцоў, пры гэтым расейцы захапілі у немцоў адну цяжкую і 3 лёгкіе гарматы, 7 кулемётоў і каля 500 палонных. На поўнач ад лініі Прасныш—Грудуск расейскае войска такжэ брала у аддзельных выпадках верх. На левым березі Віслы немцы павялічылі гарматнюю стрэляніну ў расейскіе ўзмацовываньня на Бзуры і безкарысна меціліся наступаць у районі Пíліцы. У Карпатах расейскае войска, ня гледзючы на глыбокі сьнег, мяцеліцу і сільны мароз, карысна пасовывалося ў районі Смольніка і, захапіўшы далейшые непрыяцельскіе пазыціі, узяло у палон 2400 салдат, 36 афіцэроў і 17 кулемётоў. Гэта расейская перамога ў районі глаўнай аўстрыяцкай атакі прымусіла праціўніка адыйсьці на некаторых участках Балігродзкаго напрамку. На Ужокскім напрамку, непадалёк ад Яблонкі, расейцы так сама заўладалі непрыяцельскімі акопамі. У районі Завадкі і Рожанкі непрыяцельскіе атакі не спыняюцца. У Усходней Галіччыні бітвы пашыраліся к усходу ад чыгункі Станіслав — Коломыя. Досьвета 1 марца, ідучы ў атаку па грудзі ў сьнягу, расейская пехота заўладала непрыяцельскімі умацаваньнямі непадалёк Тарновіцэ—Польно, прычым было захоплена 2000 палонных с 20 афіцэрамі і 7 кулемётоў. Каля Перамышля гарматняя стрэляніна. Расейскае войска на паўночным фронце заўладало высотамі на стрэльбавы выстрэл ад крэпасных фортоў.

4 марца. Расейскае наступленьне па абадвух берагох рэкі Ожыц пашыраецца, нягледзючы на заўзяты упор праціўніка. Каля Еднорожыца праз два дні бітвоў расейцы захапілі у немцоў 17 гармат. У Карпатах, ў районі Раббэ, расейцы так сама напіралі. Атакі немцоў і аўстрыякоў у напрамку Стрый—Мункач ізноў адбіты. На іншых усіх фронтах важнейшых перамен німа. (П. Т. А.).

**На Каўказкім фронце.** 27 лютаго расейскае войска з боем пасунулося наперад у Прыморскім районі, аткідываючы туркоў к поўдня-захаду. Бітвы ў Зачорохскім районі адбываліся на шырокім фронце. Туркі ўсюдах адбіты. У Алашкерскай даліне расейскае войска, пасьля стычкі с курдамі, аткінула іх на поўдзень. На іншых напрамках дзень прайшоў спакой-

на. 28 лютаго ў Зачорохскім краю расейскае войска, умацоваўшы Дзансульскі завод і перэвал, шляхамі ад заводу на Хопу заўзята пасоўваецца наперад, збіваючы туркоў з займаных імі пазыцый. Пробы туркоў у некаторых напрамках перайці ў наступленьня расейскае войска адбіла. 2 марца расейскае войска ў Прыморскім напрамку заўладало вёскай Архавэ і апанавало пачаткам рэкі Архавэ. На Ардакуцкім і Ольцінскім напрамку туркі такжэ былі атціснуты.

**На Заходнім (францускім) фронце**—нічога важнага.

## На вайне і каля вайны.

**„Бутэлька шампанскаго“.** Як паведамляець карэспандэнт «Daily News», немцы ужываюць новы, незвычайнай сілы ўзрыўчаты састаў. Гэтым саставам набіваюцца снарады, названые францускімі салдатамі „бутэлькай шампанскаго“, бо формай і вялічынёй падобны да гэтай бутэлькі. Думаюць, што знарады набіты рэдкім паветрам або рэдкім вугляным квасам (углекіслотой). Стрэляюць імі на далечыню самае большае ад 150 да 200 сажняў. Знарад ляціць с пачатку натта памалу, і можна ўгледзіць яго палёт. Узрыў яго такі самы, як ўзрыў 110—130 фунтоў мэлініту. (Самы найсільнейшы дагэтуль узрыўчаты састаў). Адна «бутэлька шампанскаго» робіць яміну у 6—7 сажнёў у шырыню і 4—6 сажняў, у глыбіню. З усяго, відаць, што стрэляць гэтымі знарадамі з гарматаў нельга, дзеля таго што ўзрыў пістона можэ разарваць знарад у гармаці, і дзеля гэтаго немцы для стрэляньня імі ужываюць сваіх асаблівых гармат—мортіроў. Гэтым тлумачыцца, што знарады гэтые пасылаюцца толькі на невялікую далечыню. У цяперашні мамэнт,—паведаміў афіцэр карэсп. «Daily News»,—у нас німа нічога такога, чым бы мы маглі атказаць на стральбу «бутэлькамі шампанскаго». Наш меленіт можэ гэтак стрэляць толькі у тым выпадку, калі-б можна было вельмі шмат набіць яго у знарады.

**Нямецкая адозва.** У палонных нямецкіх салдатаў, дастаўленых у Варшаву з бітвы каля Болімова, знайшлі адозву, падпісаную нямецкай глаўнай кватэрай. Змест адозвы такі:

«Салдаты! Мы прыбліжаемся да Варшавы, — да сталіцы таго краю, у якім ужо шэсьць месяцоў льецца нямецкая кроў, і дзе нашы салдаты выказалі небывалую адвагу, што задзівіла нават нашых ворагоў. Працівнік, ведаючы ўсё значэньня гэтаго горада, сабраў для абароны яго аграмадные сілы, перакінуў сюды свае корпусы с Каўказу і Сібіры. Але наша адважнае войска ўжо паказало, што нічога ня можэ устаяць проціў яго бурнаго напору, і што яно, як лявіна ністожыць усё на шляху да сваей мэты. Як возьмем Варшаву, тады мы абеспечэны, што вайна добра для нас скончыцца. Мы узмацуемся тады на абодвых берагох Віслы і патрапім дыктаваць ворагу свае варункі. Нямецкіе салдаты павінны налегчы ўсей сваей ваеннай сілай, Варшава павінна быць узята».

**Колькі каштуе усесьветная вайна.** «Т.—П. Газ.» перэдрукавала з «Vorwarts» аб тым, колькі каштуе ўсесьветная вайна.—Англіцкі урад, кажэць газэта, абвесьціў, што штодзенны расход на ваенные патрэбы у Англіі даходзіць да 1,000,000 фунтоў стэрлінгоў (фунт стэрлінгоў каля 10 руб.). Гэткім парадкам Англія павінна была ўжо зрасходаваць за 5 месяцоў вайны каля 150,000,000 ф. ст. Да 10 сьнежня агульны ваенны расход Франціі—257,000,000 ф. ст. Расея выдала у першые 3 с пал. мес вайны 192,750,000 ф. ст., а яе штодзенны расход каля 1,835,000 ф. ст. Англія, Францыя і Расея разам — кажэ далей газэта—трацюць штодзен каля 4,600,000 ф. ст., бяручы лік мабілізованых імі салдатаў у 11 мільёноў, на кожнаго салдата выходзіць каля 4 руб. у дзень. Столькі сама выдае на ваенные расходы Нямеччына і Аўстрыя. Гэткім парадкам, ва ўсіх ваюючых арміях узятых разам выходзіць што дзень ня меней 9,200,000 ф. ст. Значэ, першые 5 мес. вайны каштуе—1,500,000,000 ф. ст. або 15 мільярдоў руб. Сюды ўходзяць апрача таго страты, прычыненые вайной усесьветнаму промыслу і таргоўлі. Страты ў морскай таргоўлі (у патопленных караблёх і грузах) за першы час вайны лічыцца на 2,200—2,500 міл. ф. ст. Такім парадкам, кошт вайны па сягоняшні дзень даходзіць да небывала вялізарнай лічбы у 4,000 мільёноў ф. ст., або каля 40 мільярдоў рублёў.

## Мая песьня.

Як толькі ў сэрцы радасьць маю,
Надойдзе шчасная пара,—
Сваю я песьню зноў сьпеваю
Табе, сьвятлістая зара.
Надойдуць цяжкіе гадзіны,
Маё агорне сэрцэ жаль,—
Пяю і ў гэтые часіны,
Мой сумны сьпеў нясецца ў даль.
Прыдзе весна к нам чараўніца,
Настане сьветлы, дзіўны май—
Ізноў мне думка акрыліцца,—
Гучней пяю, мне ўторыць гай.
Зусім, здаецца, нікне горэ,
Як толькі песьню запяю
Пра сьветлы край, пра сонцэ, зоры;
Спакой ідзе ў душу маю.
І мне чароўна так стаецца.
Я доўга ўсей душой пяю,
І песьня гучна ў даль нясецца.
Я ў песьні чую моц сваю.
Ляці-ж ты, песьня, ў высь, далёка,
Над гэтай сумнаю зямлёй,
І сьветлы водгалас шырокай
Паліўся хваляю—рэкой.
Нясіся ў высь, дзе на прасторы
Нас цягнуць зоркі ў час журбы,
Што моц даюць у цяжкім горы
І ў час жыцьцёвай барацьбы!

**Я. Журба.**

## З народных песень.

**Жана па новых сенях ходзіць...*).**

Жана па новых сенях ходзіць,
Свайго мілаго просіць:
Начуй, начуй мілы хоць адну ноч
у мяне.
Начаваў-бы я і тры,—
Ужо мае коні запрэжэны,
Ўжо мае служачкі засядзеліс.
Як выйду я на вулачку,
Усе мужы з вайны едуць,
Майго ні чуваць, ні відаць.
Майго мілаго толькі конік бяжыць,
На тым коніку сядзёлачка ляжыць,
На сядзёлачку хустачка едвабная.
Ехалі каля ваконца, ўкінулі у ваконца:
Я-ж думала хустку едвабную,
Аж кашулічку крывавую,
А з вялікімі пригрозамі:
Каб без вады вымыта была,
Бяз ветру высушэна,
Бяз качалак сьлізка выкачана,
Я молада дагадліва была:
Сьлёзкамі бела вымыла
Ўздыхаючы цяжка высушыла,
Ручкі ломючы сьлізка выкачала.

*) *J. Czeczot* «Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny». Вільня 1846 г.

## Дзякуй за шчырасьць!

Пакуль уся хаўрузія з „Вил. Вѣстн.“, „Сѣв.-Зап. Жизни“, „Крестьянина і т. п. нападала на „Нашу Ніву“ і ўвесь беларускі рух да адраджэньня, даводзячы пры гэтым, быцтым яны „бароняць беларусоў ад апалячываньня“,—хто збоку слухаючы мог-бы падумаць, што і запраўды аб'явілася гэтулькі шчырых абаронцаў нашаго народу. Быў час, што пан Салоневіч нават выступаў, як *беларускі дэмакрат*, ажно гэта для яго скончылася вялікімі клапотамі...

Цяпер, дзякуй Богу, справа робіцца ўсё болей яснай, і ўсім чыста відаць, як хто глядзіць на беларускі народ і беларускую справу За гэта трэба падзякаваць „Вил.Вѣстн.“: у нумэры 3560 газэта аткрыта гаворыць, што беларуса можна адзець *толькі* або ў расейскі „армяк“, або ў польскую „чамарку“, — гэта значыць, што ніякай беларускай націі німа...

Даводзіць гэтай газэці, што беларус мае сваю *сьвітку*, што як для цела, так і для душы мае сваю асобную апратку—*мову беларускую*, німа патрэбы: гэта знаюць усе беларусы, гэта знаюць і *усе* вучоные, каторые глядзяць на беларускую справу не с палітычнаго, а з навуковаго пункту. Сваей шэрай сьвіткі, сваей роднай мовы, каторую людзі цёмные „простай“ завуць,—мы не стыдаемся і ня будзем стыдацца: вось-жэ стварылі украінцы ў Галіччыні свае гімназіі, свае унівэрсытэты, дзе вучаць па украінску, — а ці

# „СТРАЖНІК“.

I

Недалёка ад вялікай дарогі, прытуліўшыся на беразі невялічкай рэчкі, стаяла вёска Лапцэвічы. Маленькіе, крывые хаткі папрыціскаліся адна к адной, усёроўна, як нешта сабе шапталі. На ўзгорку быў невялікі хмызнячок, за ім выглядаваў млын, а далей было адно голае поле. Кругом глуха і ціха; толькі калі-не-калі с хмызнячку выскачыць зайчык і пусьціцца ў поле, ды ў ночы чутно, як выюць галодные воўкі...

Кожную раніцу і кожны вечар тутака скрыпелі дзьверы, вароты, і с комін ішоў густы дым, а пасьля зноў усё заціхала.

Якраз былі Каляды і мароз быў страшэнны. На вуліцы не было нікога, і толькі сіняўкі дымок, круціўшыся с комін, паказываў, што ў гэтых крывых хатках, закіданых сьнегам, жывуць людзі. Бывала, праўда, што ў нядзелю на дварэ і ў хаці Сарабосі быў гоман і гутарка, але толькі ў нядзелю, бо ў будны дзень рэдка хто хадзіў туда. Ды яно й праўда: што-ж ты будзеш рабіць дома сьвятам? У царкву йці—далёка, вярсты чатыры; дома сядзець зноў нудна — апрыч Сарабасі німа куды і пайці. Усё-ж такі там пагаворыш, а то дык і навіну якую пачуеш, паслухаеш, што людзі гаворуць, ды й сам прыкінеш слова, другое.

Самым першым прыходзіў да Сарабасі Амільян Касапузенка, за ім Васіль Апранік, а там другіе, і не было тэй нядзелі і сьвята, каб у Сарабасі не было зборышча.

Гэтак сама й цяпер. Зімняе сонейка даўно ўжо зайшло і над вёскай падняўся круглы месяц, а ў вокнах заблішчэлі агні. Хлопцы і дзеўчаты, як водзіцца, пачалі варажыць, зрабілі казу, мядзьведзя; бабы—каторые пашлі да суседак, а каторые дома пааставаліся, а мужчыны пасунуліся да Сарабасі.

Амільян Касапузенка, перакуліўшы дома дзьве чаркі і пасварыўшыся с сваей Альжбэтай, даўно ўжо сядзеў у Сарабасі і разам з Васілём працавалі над пляшкай гарэлкі. Трохі пачакаўшы, пачалі зьбірацца і другіе, і гадзіны церaз дзьве ў Сарабасі была поўна хата. Хто прышоў паперадзі, той сядзеў за сталом, на лаве, на зэдліку; другіе — дзе папала, а хто спозніцца, дык той або на зямлі садзіцца, або коміну падапрэ, а то дык таўчэцца с кутка ў куток.

—«Сарабася!»,—крычыць Амільян,—«давай яшчэ пляшку гарэлкі. Гуляй Амільян, бо другіх Каляд ня будзе цэлы год».

Сарабася ўжо атккаквала другую пляшку, але якраз у гэту часіну ў хату прыляцела Альбета, Амільянава жонка.

«Як, яшчэ другую?»—закрычала яна з-за парогу. «Ах ты, бязбожнік,—каб табе смалы. Там дома дзеці плачуць, а ён тутака нашоў сабе таварыша. Што гэта добрые людзі скажуць? Вот прыедзе Міхалка, як ён цябе пахваліць за гэта?»

І Альжбета хацела ўжо учапіцца Амільяну ў валасы, але Васіль Апранік схапіў яе за рукі, а то б было кепска.

Амільян баяўся сваей жонкі, але цяперака ў Сарабасі, перад людзьмі, ён захацеў паказаць, што ён галава, а ня жонка.

— «Дык што мне твой Міхалка!?» — падняўся ён за сталом. «Што Міхалка мой брат, дык табе трэба ўмешавацца не ў сваё дзела? Яна тут: «Міхалка прыедзе». Прыедзя, дык ніхай едзе. Ён служыў стражнікам, а цяпер вот разам будзем араць, ды гной вазіць. Спалохаўся я твайго Міхалкі!»

— «Ах ты, Амільян, Амільян. Дурная твая галава. Чым-жэ гэта ты хвалісься перад людзьмі?» — ўмешалася сюды Сарабася. «Альжбета кажэ праўду. Прыедзе Міхалка, людзі скажуць, як ты жыў,—ці гэта-ж будзе добра? Захочэце дзяліцца, пойдзе сварка, калатня, а ты тутака йшчэ крычыш!..»

—«А табе што за дзела? Табе чаго трэба?»—абярнуўся Амільян да Сарабасі.—«Сама дае гарэлку, а пасьля, лезе, куды ня трэба».

— «Ты не вызьверайся на людзей, калі сам вінават»—зноў закрычала Альжбета.—«Бязбожнік ты, п'яніца. Яна ня йдзе к табе ды ня просіць, каб ты браў у яе гарэлку: сам-жэ йдзеш к ёй».

— «Ну, годзе вам», — загаварыў Васіль Апранік. — «Людзі на першы дзень не сварруцца, а вы тут бітца пачнеце. Пойдзем, Амільян, да дому».

Але Амільян учапіўся рукамі за стол і хоць ты яго тапаром сячы: «не пайду» ды й толькі.

даўно „хахлы“ думалі, бытцым ім канешне трэба уздзець „армяк“ ці „чамарку“?

Ня будземо сароміцца сказаць праўду: як у кожнаго народу, так і ў нас ёсьць людзі розные—лепшые і горшые, шчырые і няшчырые. Але часта ў няшчырасьці вінавацяць іх несправедліва: гэтак „Вил. Вѣстн.“ несправедліва вінаваціць беларусоў каталікоў, бытцым яны мала рупяцца, каб здабыць правы ў касьцёлі для сваей мовы.

Мы бы парадзілі беларусам-каталікам,—пішэ газэта,—...перш, чым дамагацца беларускай мовы у школі, завясьці гэту мову, замест польскай, у хатнім жыцьці, а глаўным чынам у спаўненьні патрэб сваей рымска-каталіцкай рэлігіі. Ім жэ ніхто не бароніць вучыць дома дзяцей малітваў па беларуску, ніхто не бароніць дамагацца ад ксендза, каб ён пры споведзі вёў з дяцьмі у касьцёлі гутарку аб катэхізме па беларуску».

Рада — добрая, толькі не зусім зразумелая. Перш-на-перш беларусы-каталікі ў хаці як раз заўсёды гаварылі і гаворaць па беларуску, — хіба толькі цямнейшые „на людзях“ стараюцца ламаць язык „па панску“. А што да малітваў і касьцёла,—вось тут ужо пачынаецца нейкая каша. То-ж рэлігіі дзяцей вучаць *у школі* — ўсё роўна праваслаўные яны, ці каталікі. Чаму-ж іх *там* „Вил. Вѣстн.“ хочэ вучыць па расейску або па польску, а не пэ іхнаму — па беларуску? Нашых бацькоў і дзядоў, каторые належаць да каталіцкай веры, ксяндзы вучылі маліцца па польску, — дык дома німа каму навучыць нашых дзетак малітваў беларускіх. Гэта павінна зрабіць школа. І калі ўжо *„Вил. Вѣстн,“ прызнау, што у дамосьым ужытку і касьцелі* **і** *патрэбна беларуская мова*, дык с таго ясна выходзіць, што яна патрэбна і у школі. Ксяндзы-ж нашы (—гэта „Вил. Вѣст.“ сам добра ведае) — найбольш палякі, праўдзівые ці «перакуліўшыеся» з беларусоў, і ад іх сьведомые беларусы *дамагаюцца* уважыць беларускую мову, хаця с таго дагэтуль выходзіць карысьць толькі ў лічэных мейсцах...

Усё-ж тыкі дзякуй «Вил. Вѣстнику» за шчырасьць: ня любіць ён беларускай сьвіткі, але ўжо каталіком яе гатоў пакінуць.

Добра й тое!

а—н—а.

## Да вясковых селян.

*(Ад нашаго карэспандэнта з вілейскаго павету).*

Мушу зьвярнуцца да вас, вясковые селяне, да тых, кто астаўся дома у сваім кутку, хто не паліканы на гэту страшэнную вайну.

Падыходзіць весна, засьвеціць цяплей сонейка, адагрэіць зямельку, абсушыць яе, і пазавець аратаго да працы на узволенную ніву. Ня ўсе выйдуць у гэту вясну на свой загон, як бывала. Шмат адарвала ад сваей сям'і, ад дому цяжкая вайна і шмат хто ужо з іх злажыў косьці у полі у барацьбе. Пэўна, у вусіх, пакінуўшых сваю сялібу у часе вайны, асталася сем'я мо не зусім яшчэ здольнае да штодзеннай працы. Дык гэтак, суседзі, глядзіце, каб іх шнуркі разам з вашымі былі у пару узараны, каб і іх шнурочык не сьвеціў лыса між вашых. Прыдзецца-ж дастаць хлапчуку-падростку бацькаў плуг с-пад паветкі, за каторы ён яшчэ мо не дзержаўся, і выйсьці з ім у поле на ніву, замяніць у вусім бацьку, стаць гаспадаром, а гэта ня лёгка хлапчуку, калі яму якіх гадоў 14—15 ці меней, не зусім ён яшчэ справіцца, калі не паможэ, не падыхтуе сталы чэлавек.

Дык не абыйдзіце кругом каля такога сіраціны-гаротніка. Калі ня зможэ ён чаго уладзіць, мо ня скеміць як добра прыладзіць саху, як узагнаць нарог, мо нядобра конь запрэжаны ў працы, ці мо ў дому убачыш якіе нехваткі ці непарадкі ці што іншае, не прайдзі так сабе, уздыхнуўшы толькі цяжка. Не, але астанавіся ты ля яго і ласкава, акуратна растлумач яму, пакажы сам, як зрабіць лепей, замяні яму бацьку у гэту гадзіну. Ля цябе гэта невялікі знак, а для яго будзе шмат вартасьці і дзіцяча сэрцэ са шчырай пашанай і ўвагай аднясецца да цябе і ніколі ні забудзе тваей ласкі, ды калісьці ў жыцьці атплаціць у у дзесяць столак.

Праўда, знаходзюцца яшчэ і такіе, каторые кажуць: «а нехай, кажэ, сват паможэ». Не, браты, сват ня можэ змагчы у гэтым дзеле адзін і толькі стараньне кожнаго чэлавека памагчы чым можна у бядзе, толькі агульна шчыра узяўшыся, усё гора і бяздольле шчэзнуць. Ды і ня ўсё-ж гэтак будзе,—настане і лепшая гадзіна, абсохне зямелька ад крыві чэлавечай, разгоне вецер цёмные хмаркі, а пры вашай агульнай помачы скарэй высахне падпавекай сьлеза сірацінкі; праз колькі гадоў загоюцца жыцьцёвые раны, узрасьцець новае пакаленьне, каторае ня пойдзе крывавым шляхам сваіх дзядоў...

Міхалка Скарэўскі.

# З Беларусі і Літвы.

### З Віленшчыны.

**Абавязываючые пастановы** Глаўнаго начальніка дзьвінскаго ваеннаго округу. 1) Забараняюцца зухвалые (задзірскіе) паступкі проці ваенных чыноўнікоў, 2) забараняецца прыватным асобам умешывацца ў публічных мейсцох у адносіны афіцэроў і вышэйшых ваенных чыноў да салдатоў, 3) забараняецца без пазваленьня карыстаць з ад'знакоў Чырвонаго Крыжа і 4) забараняецца прадаваць без доктарскаго рэцэпту уселякіе саставы, у якіх ёсьць спірт і эфір. Вінаватые у невыпоўненьні каторай колечы з гэтых пастановоў будуць карацца або штрафам да 3000 руб., або арыштам у турме да 3 месяцоў.

**Проці варажбітоў.** У Вільні паліція забараніла шарманшчыкам прадаваць білеты з варожбамі аб вайне і міру.

**Карэспандэнція у жыдоўскай мові** (пісьмы і інш.), с прычыны труднасьці цэнзураваньня яе, па загаду глаўнаго начальніка дзьвінскаго ваеннаго округу, будзе знішчожывацца пры цэнзуры.

**На заразную бальніцу** у Вільні для ваенных хаўрус гарадоў асыгнаваў 110,000 руб.

**Палонные.** Надовічы праз ст. Вільня прайшоў поезд з высыланымі немцамі с-папіж жыхароў гродзенскай і ковенскай губ., лікам 100 душ. Усе высыланые старцы, кабеты і дзеці.

---

Альжбета, бачучы, што з ім нічога ня зробіш, пагразіла яму і пашла да дому.

— «Помні, бязбожнік, што дарма табе гэта не мінецца; успомніш тады, што сука табе брэхала, а не Альжбета казала. Калі прыедзе Міхалка, ён не паглядзіць, што ты астанесься ў ваднэй кашулі, а апошні кол раздзеліць папалам».

— «Як, дык Міхалка едзе да дому?» — Пачалі людзі пытаць у Амільяна, як Альжбета зачыніла дзьверы.

— «Ну, дык што-ж, едзе дык ніхай едзе. Не хацеў служыць стражнікам, дык ніхай цяпер гной возіць»,—адгрызнуўся Амільян.

— «Кепска», сказаў стары Янук. «Кепска, суседзе. Німа нічога горшаго, як дзьве сям'і сагнаць ў вадну хату. Яно хоць і сваё, але ўсё такі чужое. Я ўжо гэта ведаю, бо сам гэтак жыў».

Амільян нічога не сказаў і пазіраў недзе ў куток. Усё п'янства выляцела ў яго з галавы. Успомніў ён, як яны з Міхалкам адны асталіся пасьля бацькі. Амільян, як старшы, ўзяўся за гаспадарку, а Міхалка ўсё хадзіў у школу вучыцца. Як цяжка прыходзілася Амільяну — сам невялікі, помачы німа, а тут падаткі плаціць трэба, то солі купіць, запалак, дый Міхалка цягне грошы... Але ўсё ён перацярпеў. Адна беда, што гарэлку навучыўся піць, дык і то не з радасьці. А цяпер... на, табе! Ён думаў, што калі ўжо выўчыў Міхалку, дык той і жыць будзе асобне, а тут вось якая падзяка: едзе дамоў, пішэ, дзяліцца!

— «Э... Амільян»,—засьмеялася Сарабася. «Табе сягоньня нешта не шанцуе: то з бабай пасварыўся, то ўжо плакаць хочэш, што Міхалка да дому едзе. Ды ці варта думаць аб гэтым? Так будзеце жыць, што толькі людзі завідываць будуць».

— «Не, тваё дзела лезьці, куда цябе ня просюць!» — адгрызнуўся Амільян, націснуў шапку і пашоў да дому.

— «А... папаўся»,—пусьціў яму ў дагонку сусед Мікалай. «Гэта табе не са мною, што ты мне праходу не даеш». І ён зарагатаў нейкім дзікім голасам.

Як толькі Амільян вышоў с хаты, ўся вясёласьць тамака адразу прапала, і мужчыны адзін за адным сталі зьбірацца да дому. Астаўся толькі адзін Васіль Апранік, але і таго Сарабася выправадзіла, бо тым часам запеў ужо першы пявун.

На мінуту вуліца загаварыла, дзе-не-дзе загаўкалі сабакі, а пасьля зноў усё сціхло, і толькі месяц адзінока пазіраў у ніз, ды ў хмызнячку жаласна цягнуў сваю песьню галодны воўк.

Невясёлы вярнуўся Амільян ат Сарабасі. Ен даўно ведаў, што Міхалка едзе да дому але дагэтуль усё ня думаў аб гэтым. Толькі цяпер ён зразумеў, як трудна яму будзе, калі прыедзе Міхалка і скажэ, што трэба дзяліцца. А што дзяліць? Пасьля бацькі Амільяну астаўся трысьцен на гумне, хата і старая каняжына ды двое парасят, а рэшту ён сам прыдбаў. Дзяліцца-ж трэба, бо жыць разам німа як. Міхалкавы дзеці прывыклі жыць па панску, жонка зноў не захочэ капацца тут у гразі...

Ў гэтакіх думках Амільян пракачаўся ўсю ноч і толькі ўжо раніцай, як Альжбета стала падпаліваць у печы, тады ён трохі задрэмаў, ды й то доўга не паспаў. Толькі што ён заснуў, як яму здаецца, што ён малы, трэба ехаць араць. Міхалка пасьнедаў і ўзяўшы свае кніжкі, пашоў у школу, а маці гатуе торбачку Амільяну. Пасьля, здаецца, ён на полі арэ, скора ўжо вечар, хораша так, цёпла, у гары шчабечуць жаваранкі, а вунь ужо й Міхалка йдзе да дому. Вот ён ўжо падыйшоў бліжэй, але гэта ўжо ня той Міхалка, што хадзіў у школу: гэта Міхалка — стражнік с шабляй і пісталетам.

— «Гэта мая земля»,—крычыць ён на Амільяна. «Вон адгэтуль, а то застрэлю!»

Амільян прачыхаецца ўвесь мокры, сэрца так скора б'ецца, што ўсё роўна, як хочэ выскачыць з грудзей.

— «Альжбета, дай вады» — крыкнуў ён, і яго вочы нейк страшна-страшна закаціліся пад лоб.

— «Божухна! Амільян, што табе? Манька, дай вады», —крыкнула Альжбета на старшую дачку.

Ледзьве рашчапілі яму рот і ўлілі вады Дзеці загаласілі, пасаскаківалі с печы, павылазілі з запечка, абступілі кругом Амільяна. Альжбета плачэ—проста чысты гвалт.

— «Амільян, што табе, чуеш?»—тармашыла яго Альжбета. «Што табе зрабілася?»

— «Нічога, дзеткі, нічога. Мне галава закруцілася, мусіць, ад таго, што ўчора трохі лішняе выпіў у Сарабасі», — і ён падняўся і стаў надзеваць кажух.

— «Дык куды-ж ты пойдзеш? Ляж, паляжы, а то кепска будзе. Божэ мой мілы, гэта-ж горай будзе, як ты выйдзеш на двор! Ляж, я табе папраўлю сяннік».

— «Ня трэба! Вось я выйду на двор, пайду, дам каню сена, пахаджу па дварэ і ўсё пройдзе. Ціха, дзеткі, не плачце, гэта толькі ваша матка ўсё плачэ, брыдка плакаць»,— і Амільян выйшоў на двор.

— «Матка Божа!—крычала Альжбета,— памажы, не пакідай!—і сьлёзы. як гарох, пакаціліся у яе з вачэй. Трохі пачэкаўшы, ў хату увышоў Амільян, і, як нічога і не было, сеў сьнедаць і стаў жартаваць з дзецьмі.

С. Бірыло.

(Далей будзе).

